Аўтар: Войтава Анастасія Дзмітрыеўна,
вучаніца VIII класа ДУА “Сярэдняя
школа № 43 г. Магілёва”
(настаўнік – Асіповіч Алена Адамаўна)

# ШТО ТАКОЕ АДЗІНСТВА?

«Мы з вамі дзеці адной гісторыі, аднолькавай сучаснасці і агульнай будучыні. Нас яднае агульны лёс. Нават у “важлівых дробязях”», – напісаў у прадмове да сваёй кнігі «Зямля пад белымі крыламі» Уладзімір Караткевіч. Мінула амаль паўстагоддзя з часу першага выдання нарыса. За гэты перыяд адбылося нямала змен у жыцці Беларусі і беларусаў. Але словы вядомага пісьменніка, адрасаваныя падлеткам, не страцілі глыбіні і значнасці. Яны «чапляюць», помняцца і заклікаюць прыпыніцца, каб паразважаць. Падумаць над тым, што аднолькава важна ва ўсе часы для ўсіх узростаў.

Калі я думаю пра гэта, першым чынам узгадваю, якая неабдымная планета Зямля, як многа на карце краін і народаў. У кожнага з іх свая асаблівая мова, гісторыя, культура. Але ўсе яны складаюць адзінае цэлае – чалавецтва.

Пасля прыходзіць на думку, якая вялікая і розная наша Беларусь, хоць і ўспрымаецца звыкла як невялічкая краіна ў цэнтры Еўропы. Багацце нашай прыроды, разнастайнасць мясцовых гаворак, адметнае аблічча вёсак і гарадоў на самой справе ўражвае. І гэта ўсё таксама складае адно цэлае.

Можа, яно не настолькі кідкае і гучнае, як патрабуе сучасны свет, захоплены рэкламай. Але яно ёсць, толькі пільна прыглядзіся. Яно, адметнае і непаўторнае, у прыродзе, асаблівасцях пейзажаў, у помніках архітэктуры і забудове населеных пунктаў, у мове і характары яе носьбітаў. І ўсё гэта гарманічна суіснуе ў межах аднаго цэлага пад назваю Беларусь. Таго жывога і адметнага цэлага, часткай якога з’яўляюся і я. Я кажу пра гэта з гонарам. Бо сапраўды шаноўна адчуваць сябе нашчадкам тых, хто ствараў гісторыю маёй зямлі, культуру майго народа, уплываў на лёс і аблічча маёй любімай Бларусі.

Сёння кожны імкнецца стаць індывідуальнасцю, непаўторным, не дай Бог, быць такім як усе. Гэта цяпер так актульна, модна выглядаць па-іншаму, на ўсё мець сваё меркаванне, а яшчэ лепш, калі твае погляды і жыццёвыя прынцыпы ідуць у разрэз з агульнапрынятымі, адмаўляць і крытыкаваць усё, што робіцца, што прапаноўваецца. Галоўнае “хайпануць”, быць папулярным, каб цябе заўважылі, пра цябе гаварылі, табою захапляліся… І няважна, што даводзіцца крывадушнічаць, прыстасоўвацца да новых павеваў часу, важна быць, як кажуць, у “трэндзе”. Але гэта толькі павярхоўнаму воку не відаць ісціны, сапраўдных матываў, якія рухаюць нашым грамадствам. Калі пільна прыгледзецца, удумліва паразважаць, то карціна жыцця твайго і майго не такая ўжо і розная. Ёсць тое, непамерна большае за вонкавае, напускное, што зближае, яднае, родніць нас.

Прыгадай толькі пэўныя значныя моманты свайго жыцця. Свята Вялікадня, і ты разам з сотнямі і тысячамі такіх раней розных, аднолькава павязаўшы на галаву хусцінку, напакаваўшы кошык выпечанымі з любоўю кулічамі і пафарбаванымі чырвонымі яйкамі, спяшыш да царквы, каб асвяціць

усё гэта, а потым за сталом з сям’ёй і з блізкімі услаўляць уваскрэшанне Хрыстова. А праз дзевяць дзён на Радаўніцу ўжо імкнешся паспець на могілкі, каб аддаць даніну памяці сваім памерлым сваякам, “пахрыстосавацца” і з тымі, каго няма ўжо сярод нас. Вяртаешся з могілак, доўга прастойваючы ў аўтамабільных “пробках”, бо зноў-такі, такіх, як ты, сотні і тысячы. А Купалле, калі ў кожнай вёсачцы запальваюць уначы вогнішчы, спяваюць, скачуць праз агонь, плятуць вянкі і пускаюць іх на ваду, жадаючы прадбачыць свой будучы лёс.

Па-асабліваму шчымліва сціскаецца сэрца ад пачуцця гонару і бязмернай падзякі Магілёву, магілёўцам і ўсім беларусам, калі штогод 9 Мая, на свята Перамогі, я стаю ў шэрагах сотняў і тысяч святочнага калідору ў гонар бессмяротнага подзвігу, надзвычайнага гераізму нашага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны. Гучыць музыка аркестра, праходзяць строем маладыя ваенныя, праязджае баявая тэхніка, і тут з’яўляюцца яны, бясстрашныя змагары з фашысцкімі захопнікамі за нашу мірную будучыню. Грудзі іх увешаны узнагародамі, крок іх ужо няцвёрды, некаторым цяжка даецца кожны рух, але галавы прыўзняты, у вачах вялікая радасць – гэта шчасце перамогі і міру. А далей ідуць тыя, хто склалі свае галовы на полі бою, хто загінуў на вайне, хто не дажыў да свята Перамогі. Ідзе бессмяротны полк. Дзеці, унукі і праўнукі нясуць у руках партрэты тых, хто на гэты раз не змог далучыцца да ўсеагульнага лікавання Вялікай Перамогі, як сімвал памяці і пашаны. У час Вялікай Айчыннай вайны Магілёў 23 дні трымаў абарону і па праву носіць ганаровае званне горад-ардэнаносец. У гэты дзень я, як і сотні-тысячы магілёўцаў, традыцыйна наведваю месца баявой славы сваіх суайчыннікаў – мемарыяльны комплекс “Буйніцкае поле”, каб ушанаваць памяць продкаў, якія цаною свайго жыцця адстаялі мір на нашай зямлі. І зноў усе разам, такія дагэтуль розныя і непрыхільныя.

І нельга не пагадзіцца са словамі нашага Прэзідэнта А.Р.Лукашэнка: “Мы павінны разумець, што мы толькі разам можам выратаваць гэты кавалак зямлі. І нашы дзеці змогуць пасля нас жыць сваім розумам на сваёй зямлі”.

Гэта цешыць. Гэта натхняе час ад часу прыпыняцца і задумвацца: хто ты і куды ідзеш. А пасля – зрабіць нешта, каб роздумы не засталіся проста словамі. Тое, што ты можаш. Там, дзе ты ёсць. Напрыклад, падзяліцца тым, што ведаеш і адчуваеш, з іншымі. Каб і яны ўзгадалі: мы – дзеці адной гісторыі, адной культуры, адной зямлі, назва якой Беларусь.